Аддай — і вернецца...

У Беларусі шмат робіцца для папулярызацыі багатай кніжнай спадчыны папярэднікаў, якая зберагаецца ў тым ліку і ў кнігасховішчах суседніх краін

Супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на экскурсіі ў Бібліятэцы Урублеўскіх

Нашы чытачы ведаюць ужо пра некаторыя знакавыя беларускія кніжна-культурныя праекты апошняга часу, сярод якіх факсімільнае перавыданне ўсіх кніг Францыска Скарыны, а таксама ацалелых фрагментаў знакамітага Тураўскага Евангелля XI стагоддзя. Пра тое, у прыватнасці, былі тэксты "Добрая вестка з Турава" (ГР, 4.09.2014), "Вяртаць. Чытаць. І разважаць" (ГР, 11.09.2014), "У Маскву — з кнігамі" (ГР, 23.07.2015). У апошнім з іх намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па навуковай рабоце Алесь Суша расказваў аб прэзентацыі гэтым летам у Маскве, у Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расіі, унікальнага факсімільнага выдання "Кніжная спадчына Францыска Скарыны". Тады ж беларусы і ў самыя буйныя маскоўскія кнігасховішчы падарылі па пяць першых скарынаўскіх тамоў.

Былі ў СМІ згадкі і пра ўрачыстую прэзентацыю факсімільнага перастварэння фрагментаў Тураўскага Евангелля ў Вільнюсе: 18 чэрвеня, пад час Дзён культуры Беларусі ў Літве. Чаму і як тое адбывалася, а таксама пра супрацоўніцтва беларускіх вучоных, бібліятэкараў, кнігазнаўцаў з калегамі з Літвы і Украіны — наша чарговая гутарка з Алесем Сушам.

— Спадар Алесь, што канкрэтна і дзе ў Вільнюсе адбывалася?

— Там прайшоў, я б сказаў, цэлы комплекс мерапрыемстваў. Гэта быў двухдзённы візіт супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да калег. Асноўная падзея — прэзентацыя факсімільнага выдання Тураўскага Евангелля. Тое адбывалася ў будынку Прэзідыума Літоўскай акадэміі навук: у самым цэнтры горада, на праспекце Гедыміна, насупраць Кафедральнага сабора. Урачыстасць праходзіла ў шыкоўнай Вялікай зале Акадэміі, і ў ёй удзельнічала нямала беларусаў, што цяпер жывуць у Вільнюсе. Шмат прыйшло літоўскай інтэлігенцыі, у тым ліку даследчыкі, выдаўцы, дзеячы культуры, журналісты. Пад час прэзентацыі выступілі прэзідэнт Літоўскай акадэміі навук Вальдэмарас Разумас, дырэктар Бібліятэкі Урублеўскіх Сігітас Нарбутас — ён, дарэчы, з вядомага ў Беларусі шляхецкага роду Нарбутаў. Прымаў удзел і Пасол Беларусі ў Літве Аляксандр Кароль, сказаў прыгожае слова. Пасольства выступала і адным з арганізатараў мерапрыемства, разам з Бібліятэкай імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук і нашай бібліятэкай. Выступалі яшчэ мы з дырэктарам НББ Раманам Матульскім ды літоўскі даследчык Сяргей Цемчын. Паехалі ж мы туды, каб нібыта паставіць кропку ў вялікім і важным міжнародным праекце ўзнаўлення Тураўскага Евангелля. Як вядома, у Вільнюсе, дзе зберагаюцца ацалелыя аркушы кнігі, мы ўзялі яе лічбавую копію — туды ж і прывезлі гатовую факсімільную кнігу. → Стар. 3

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Аддай — і вернецца...

(Заканчэнне. Пач. на стар. 1)

— Узялі — будзённа гучыць, асабліва ў дачыненні да фрагментаў нацыянальнай святыні, самай старажытнай кнігі на тэрыторыі і Літвы, і Беларусі. Як гэта ўвогуле ўдалося: узяць?

— Можна сказаць: пашанцавала, так зоркі сталі... А пачыналася ўсё са звароту з Мінска ў Вільнюс, мы прасілі калег: давайце паспрабуем, давайце разам зробім карысную справу для Літвы і Беларусі. Гэта было яшчэ гадоў пяць таму ці больш. Рабіліся, дарэчы, спробы атрымаць лічбавыя копіі ацалелых фрагментаў Тураўскага Евангелля і больш раннія, ды без выніку... І вось нашы калегі з Бібліятэкі Урублеўскіх пайшлі насустрач: на пэўных умовах прадаставілі нам лічбавую копію. Яе мы і выкарысталі, калі рабілі факсімільнае ўзнаўленне культурнага помніка. На той аснове падрыхтавалі грунтоўнае выданне — з навуковымі даследаваннямі, дадаткамі на беларускай, рускай ды англійскай мовах. І вось — прэзентацыя, на ёй некалькі экзэмпляраў факсімільнага выдання былі перададзены ў Бібліятэку Урублеўскіх.

— Мне ўспамінаюцца такія паэтычныя радкі: "Аддай — і вернецца табе, як покліч рэхам,/ Прасі — і дасца ў спрацаваную далонь:/ Як дождж — зямлі, як снег — вясковым стрэхам,/ Што бруд сцярпелі восені гнілой"... Бо не толькі ж на грошы пабагацела Бібліятэка Урублеўскіх, калі дала ў Беларусь копію нашай святыні. Далі — і аддадзенае вярнулася ім цікавым выданнем. Ды яшчэ і вялікаю ўдзячнасцю. Мяркую, гэта і прыклад для іншых, хто гатовы да супрацы з беларусамі. Тыя 10 аркушаў Евангелля ў сховах — безумоўна, велізарная каштоўнасць. А тут яна яшчэ і цудоўным чынам прымножылася...

— Так, праект атрымаўся ўзаемакарысным і знакавым. І ўжо на прэзентацыі мы разумелі: гэта кропка толькі ў адным праекце, а ў супрацоўніцтве — шматкроп'е… Прыкідваем, што яшчэ можна супольна зрабіць. Для Беларусі першачарговае значэнне маюць пытанні захавання і папулярызацыі той беларускай спадчыны, што захоўваецца ў Вільнюсе. І для Літвы Тураўскае Евангелле вельмі каштоўнае: гэта ж самы старажытны кніжны помнік з тэрыторый, што некалі ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, нашай агульнай дзяржавы. Больш ранняй кнігі ў Літве не захавалася. І літоўцы ўжо капалі глыбока, вывучаючы аркушы. Ёсць і ў Літве даследчыкі кшталту Сяргея Цемчына, што працуе ў Інстытуце літоўскай мовы. Ён даволі глыбока даследаваў мову Тураўскага Евангелля.

Раман Матульскі (злева) і Сігітас Нарбутас

Фрагмент Тураўскага Евангелля

— Аднак гэткага знаўцы самога старажытнага Турава, напрыклад, як наш даследчык-археолаг Пётр Лысенка, у Літве няма...

— Тым і карысная супраца: кожны вывучае помнік, скарыстоўваючы нейкія свае веды. Скажам, візуальнае аздабленне Тураўскага Евангелля, яго ілюмінацыю найлепш даследавалі расіяне, у прыватнасці, Васіль Пуцко. Як вядома, кніжныя помнікі — гэта комплексныя з'явы культуры. Пры аналізе кожнага патрэбны розныя спецыялісты: каб разгледзець помнік з усіх бакоў, калі падобныя даследаванні не рабіліся. Добра, як ёсць напрацоўкі папярэднікаў. А іх важна звесці ў адзін тэкст, у адно выданне.

— Інтэгральная такая праца атрымліваецца... Вам асабіста яна па душы?

— Так. Я культуролаг і ў тым сябе ўпэўнена пачуваю. Культуролагі даследуюць культуры ў цэлым: духоўную і матэрыяльную, высокую і штодзённую, асобныя яе сферы.... Мне імпануюць заўжды спробы звесці розныя даследаванні ў агульную форму. Падаць іх на адной мове. А працэс гэты, можна было пераканацца і на прыкладзе з факсімільным узнаўленнем Тураўскага Евангелля, надзвычай складаны.

— Ды ўсё ж, як вы сказалі, ёсць у планах і новыя супольныя праекты з Літвой?

— Планы ёсць, ідэі ёсць, а праектаў канкрэтных пакуль няма. Мы прагаворвалі з кіраўніцтвам Бібліятэкі Урублеўскіх магчымасць падпісання Дамовы аб супрацоўніцтве. І нават такі праект падрыхтаваны. Цяпер фармулюем канкрэтныя прапановы па нашай супрацы. Нам, вядома ж, вельмі цікавая тая частка нашай кніжнай спадчыны, што захоўваецца ў Літве. А там вельмі шмат каштоўных кніжных помнікаў. Гэта, напрыклад, і Мсціжскае Евангелле (з тэрыторыі цяперашняга Барысаўскага раёна), і кнігі са зборaў Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча, і кнігі з калекцыі Віленскай публічнай бібліятэкі (а там збіраліся самыя старажытныя рукапісы і старадрукі), многія іншыя каштоўнасці. У Вільнюсе захоўваюцца шматлікія выданні віленскія, а таксама аршанскія-куцеінскія, магілёўскія, супрасльскія ды іншыя. І гэта для нас вельмі цікава. У Беларусі, напрыклад, цяпер ёсць толькі 2 экзэмпляры друкаванай Берасцейскай Біблії, выдадзенай у 1563-м на сродкі і намаганнямі Мікалая Радзівіла Чорнага (450-гадовы юбілей яго сёлета святкуем). Прычым адзін з іх — гэта адносна нядаўна куплены фрагмент, другі ж больш-менш поўны экзэмпляр, але таксама з пэўнымі дэфектамі. І быў ён перададзены ў Беларусь менавіта з Літвы. У той жа час у адной толькі Бібліятэцы Урублеўскіх ёсць яшчэ некалькі такіх экзэмпляраў Берасцейскай Біблії, прычым поўных.

— І на якіх умовах каштоўнасць перададзена была ў Беларусь?

— Гэта было яшчэ за савецкім часам, таму — бясплатна.

— А з Бібліятэкі Храптовічаў са Шчорсаў, з нашага Панямоння нічога туды не трапіла?

— Ёсць некалькі рарытэтаў і адтуль. Але — адзінкавыя, як і ў нас. Адна кніга са Шчорсаў, дарэчы, параўнальна нядаўна была выяўлена ў нашых фондах. Але гэта выключэнні, бо пераважная большасць кніг са збору графаў Храптовічаў у свой час была перавезена ў Кіеў. І там захоўваецца. Для нас, а таксама і для літоўцаў яны маюць вялікую цікавасць.

— З кіеўскімі калегамі ў вас ёсць кантакты па той калекцыі? Што канкрэтна там ляжыць?

— На працягу гадоў пяці з Кіевам вядзецца супраца па Бібліятэцы Храптовічаў. У свой час яна была інцыявана на ўзроўні ЮНЭСКА — дзякуючы нашай Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЭСКА. Былі выдаткаваныя фінансавыя сродкі на правядзенне першаснага даследавання і ўліку тых помнікаў. Украінскія спецыялісты зрабілі лічбавыя копіі тытульных аркушаў кніг — і на большасці з іх ёсць экслібрысы Шчорсаўскай бібліятэкі. На іх аснове нашы спецыялісты зрабілі бібліяграфічнае апісанне. І прынамсі кнігі ранняга часу — а гэта XV, XVI, XVII стагоддзі — былі ўлічаныя. І ў выглядзе электроннага выдання такая бібліяграфічная рэканструкцыя пару гадоў таму пабачыла свет у НББ. Гэта быў вельмі яркі, важны праект. І гэтая праца прадаўжаецца. Нашы калегі з Кіева працуюць па Бібліятэцы Храптовічаў як з планавай тэмай, у бліжэйшым часе, мяркую, усю калекцыю апішуць. І мы будзем мець пра яе даволі поўнае ўяўленне. Больш таго: у выданні, мною згаданым, ёсць некалькі лічбавых копій саміх кніг у поўным аб'ёме — ад першай да апошняй старонкі. Гэта мы дамовіліся-папрасілі іх туды ўключыць. У прыватнасці, там ёсць вельмі каштоўны рукапіс Статута ВКЛ у другой рэдакцыі 1566 года.

Дэлегацыя з Мінска на Гары Гедыміна

— Вернемся ў Вільнюс. Дамова аб супрацоўніцтве з Бібліятэкай Урублеўскіх у вас рыхтуецца. А з іншымі кнігасховамі?

— Была дамова з Нацыянальнай бібліятэкай Літвы імя Мажвідаса, ёсць стасункі з Універсітэцкай бібліятэкай. Кантакты ўмацоўваем. На гэты раз для спецыялістаў НББ была паўнацэнная стажыроўка, мы пабывалі ў буйнейшых бібліятэках Літвы. Найперш — у Бібліятэцы Урублеўскіх, кнігасховішчы класічнага кшталту. Там зберагаюць спадчыну, і гэта іх асноўная місія. Багацейшыя беларускія і літоўскія зборы. Нам у натуральным выглядзе ўсё паказвалі: і Тураўскае Евангелле, і Мсціжскае Евангелле…

— Як, дарэчы, зберагаецца там Тураўскае Евангелле: у нейкай скрыніцы ці пакеце?

— У скрынках, у спецыяльных сховішчах, умовах. Задачу захавання спадчыны калегі выконваюць цудоўна. А на другі дзень нам паказалі Бібліятэку Вільнюскага ўніверсітэта. Яна і старая класічная з адначаго боку, і ў нагу з часам ідзе. Заснавана ў часы ВКЛ пры падтрымцы ў значнай меры і Радзівілаў, і Пятра Скаргі ў XVI—XVII стагоддзях. Была пры Віленскім калегіуме, пры Віленскай езуіцкай акадэміі. Там багацейшыя беларускія зборы. Нам паказалі і стары будынак у цэнтры горада, тамтэйшыя беларускія зборы, калекцыі іншых цікавых аб'ектаў. Потым глядзелі і нядаўна ўзведзены будынак: за горадам, у зоне кампусаў. Гэткі адукацыйна-культурны цэнтр, які працуе 24 гадзіны ў суткі, тысячы наведнікаў. Выдача, вынас кніг з бібліятэкі, вяртанне на канкрэтную паліцу — усё аўтаматызавана. На кнігах — радыёчастотныя меткі, па іх працуюць камп'ютары. Зоны для працы зручныя, у тым ліку і для чытачоў з дзецьмі.

— Нешта будзеце перайманць?

— Натуральна! Для таго й паехалі. Мы адзін у аднаго вучымся. Літоўцы як будавалі новы корпус — да нас ездзілі досвед пераймаць, а цяпер мы іх паглядзелі. Яшчэ нам паказалі Музей Уладароў, ці Палац Вялікіх князёў Літоўскіх, адкрыты ў адрэстаўраваных карпусах Ніжняга Віленскага замка. Шыкоўная экспазіцыя, якая ілюструе нашу агульную беларуска-літоўскую гісторыю. Усё прыгожа, ярка, цікава, пададзена па-майстэрску. Сёе-тое мяркуем і адтуль пераймаць.

— А нешта хоць віртуальнае ці лічбавае вам калегі літоўскія змогуць перадаць?

— Яны і перадаюць! Мы актыўна займаемся і рэальным, і віртуальным дакументаабменам. Рэальны — гэта, напрыклад, калі некаторыя кнігі з Віленскай беларускай бібліятэкі імя Івана Луцкевіча атрымалі ў межах дакументаабмену. Мы перадаем у Літву цікавыя для нашых калег кнігі, яны — цікавыя для нас, звычайна з дублетаў. Такі абмен надзвычай карысны. Калі ў нас нейкага выдання 5 экзэмпляраў, а ў іх ніводнага, то смела абменьваемся. А таксама лічбавымі копіямі: многае атрымалі. Дарэчы, літоўцы маюць ці не найлепшы ў Еўропе досвед стварэння электроннай калекцыі кніжных помнікаў і помнікаў культуры. Яны стварылі на базе Нацыянальнай бібліятэкі Літвы каардынацыйна-метадычны цэнтр праекта "Электронная спадчына". На яго ў Еўропе глядзяць як на адзін з самых прагрэсіўных. Ён добра метадычна адпрацаваны: што і як адбіраць для ўключэння ў рэестр, па якіх крытэрыях апісваць помнікі... І ў нас цікавых напрацовак шмат. Так што супрацоўніцтва ў нас — узаемакарыснае.

Гутарку вёў
Іван Ждановіч